ТОЦ
318746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

***Аўтары:***
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

**Рэцэнзенты:**
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

Б43 **Беларуская мова:** Дыктанты, пераказы, пераклады: 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

**УДК 808.26(075.3)**
**ББК 81.2Беи-922**

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**Дыктанты, пераказы, пераклады**
**8 клас**
Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў
*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 1669.
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.2000.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-9?
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

**ISBN 985-478-208-5**

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

# ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

II. По Москве можно ходить без конца. Мы выходим к Пушкинской площади, от Пушкинской спускаемся к Трубной, оттуда по Неглинке идём к Большому театру, потом к Каменному мосту... Я готов ходить бесконечно... Гаснут фонари на улицах. Небо, дождавшись темноты, опускается ниже, звёзды становятся больше. Потом начинается тихий рассвет.

*По Ю. Казакову*

III. С моря поднималась туча. Она ползла в степь. С её вершины срывались клочья облаков, неслись вперёд её и гасили звёзды одну за другой. Море глухо шумело.

*По М. Горькому*

**СЛОЎНІК**

голубова́то-при́зрачный — блакітнава́та-падма́нлівы
нату́жно — нату́жліва
приника́ть — прыпада́ць, прыту́львацца
фона́рь — ліхта́р

**ЗАДАННІ**

1. Перакласці тэксты на беларускую мову.
2. Падкрэсліць акалічнасці, указаць іх тыпы.

# ПРОСТЫ СКАЗ:
## АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

**Летнія дажджы**

Між Ільёй і Спасам пачынаюцца ледзь не кожны год дажджлівыя дні. І дажджы з громам і маланкамі выпадаюць уночы. Цэлы дзень парыць. Гэта на дождж. Але неба чыстае, і ярка свеціць сонца. Як толькі яно зойдзе, на краі неба з'яўляюцца хмаркі. Хутка растуць яны і вылазяць з-за лесу. Грозныя хмары з чырвонымі краямі агромнымі клубкамі ціха і важна націскаюцца на неба. Як толькі сцямнее, пачынае бліскаць маланка. Грому яшчэ не чутно. А хмара ўсё паўзе і паўзе, усё большую і большую займае частку неба.

Уночы маланка мае свой асобны вобраз, сваё хараство і цікавасць. Уночы і голас грому мае сваю асобную грозную музыку, поўную нейкага невядомага страху, які цяжка пераказаць словамі. Яго толькі можна чуць душою. Ім б'ецца сэрца ў нейкім салодкім заміранні і чаканні. (125 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і выпісаць аднасастаўныя сказы.
2. Вызначыць іх віды і форму выражэння ў іх галоўных членаў.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## КАМЕНЦІРАВАНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Дуброва

Уехалі ў лес і згубіліся ў зялёных вяршынях соснаў. Дрэвы стаялі яшчэ мокрыя. Добра тут хвастаў начны дождж, шмат назбіваў лісця. Нават былі абламаны некаторыя танчэйшыя галіны. У ручаях, што шыліся праз траву і мох, плыло збітае дажджом лісце.

Спусціліся на конях у сырую лагчыну. Лес тут перарваўся вялікім прагалам-палянаю. Леваруч ад сцежкі ўбачылі агромністы таўсматы дуб. Начны ветравал вывернуў яго з зямлі, паклаў на бок. Шырокія лісты падсвечвала сонца. Дужа шмат жалудоў было на дубе, шмат іх было рассыпана ў траве. На бугорыстай, пасечанай сякерамі гадоў, кары пырхалі бліскучыя стракозы. Даўжэзныя карані, што яшчэ зусім нядаўна жылі пад зямлёй, бездапаможна тапырыліся ў неба, высушваліся сонцам і ветрам і ўвачавідкі бялелі.

Далібор убачыў заліты сонцам узгорак, дзе стаяла светлая дуброва. (120 слоў)

*Паводле Л. Дайнекі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і выпісаць няпэўна-асабовыя сказы.
2. Вызначыць, чым выражаны галоўныя члены ў іх.
3. Якую сэнсава-стылістычную функцыю выконваюць аднасастаўныя сказы ў тэксце?

### Куток Палесся

Палессе. Брэстчына. На ўсход ад Івацэвіч. Чэрвень 1970 года.

Азёры. Лес, пералескі. Буйная зеляніна лугоў і палёў. То сонца, то церушлівая хмарнасць, то зноў грымоты і лівень.

Замест вёскі Красніца — проста лес, ужо немалады. І помнічак каля дарогі — па цэлай вёсцы людзей. Замест Тупічыц і Вяды — ні лес, ні поле, ні луг.



Дзе былі Тупічыцы, там стаяць самотныя грушы і ледзь не да жудасці незвычайныя, абгарэлыя дубы, што будуць дажываць свой доўгі век ужо без людзей. Сюды мы, выйшаўшы з лодкі, ад возера дабіраліся па глыбокім пяску, здорава патужэлым пасля многіх сёлетніх навальніц.

Тое месца, дзе была калісьці вёска Вяды і дзе цяпер пясок, трава і рэшткі дрэў, якія калісьці раслі ў садах і на вуліцы, мы бачылі здалёк, з узгорка, на якім стаіць самотны абеліск са словамі і лічбамі. (133 словы)

*Паводле А. Адамовіча*

**ЗАДАННЕ**

Падкрэсліць у тэксце аднасастаўныя сказы і вызначыць іх віды.

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Госць

Зіма. Нядзеля. Ноч. Прайшоў добры ўсадзісты снег, і на самым пачатку падслепаватай раніцы, калі з-за Аленінага плота на вуліцу вынырнуў невысокі чалавек, сяло выдавала глухім і сонным. І быццам усё яно было заліта сінькай. Чым далей хапала вока, сінька тусцела, набракала, пераходзіла ў фіялетавае.

Насупраць Аленінага двара цераз вуліцу стаяў калодзеж з вядром, і чалавек збочыў туды. Дастаў вады, доўга і асцярожна піў, пасля выліў з вядра ваду на снег, пусціў вядро і пайшоў далей.

Трымаўся чалавек сярэдзіны вуліцы, ішоў хутка, акуратна сцелючы за сабой сляды-«елачку». Быў на ім кароткі, колеру вываранай альховай кары, кажух і зімовая шапка з калматай, злямчанай аўчыны. Увесь час, як толькі паказаўся з-за плота, чалавек пазіраў на замураваныя марозам вокны Аленінай хаты. (117 слоў)

*Паводле А. Кудраўца*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць у тэксце аднасастаўныя сказы.
2. Вызначыць іх віды.
3. Растлумачыць сэнсава-стылістычную функцыю аднасастаўных сказаў у тэксце.

## ТВОРЧЫ ДЫКТАНТ

### Вясновая квецень

Сады ў тую вясну зацвілі напярэдадні мая. Зацвілі буйна, на ўсю сваю неадольную сілу. Нібы хто з агромністага каўша абліў яблыні, грушы, вішні ружавата-белай пенай, і яны ўхуталіся ў яе ад вершалін аж да самай зямлі.

Дзіўна было глядзець на ўсё гэта. Дзіўна і радасна. Вайна, смерць, а сады цвітуць, жывуць, не хочуць здавацца.

І людзі жывуць, цягнуцца да жыцця, нягледзячы ні на што. Здавалася б, што цяпер дзеду Лук'яну да саду. Яблыкі з яго ўсё роўна немцы забяруць. Хай сабе цвіце, расце як хоча. Дык не. Паклікаў Якімку і павёў у сад... (93 словы)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННЕ**

1. Прыдумаць заканчэнне тэксту і запісаць, выкарыстоўваючы аднасастаўныя сказы, захоўваючы дадзены стыль тэксту.

## ВОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Навальніца

З захаду плылі хмары. Плылі павольна, не спяшаючыся. Хмары былі чорныя, цяжкія. Яны спускаліся ўсё ніжэй і ніжэй, быццам хацелі прыціснуць, прыглушыць на зямлі ўсё жывое. І лес прыціх, затаіўся. Першымі замоўклі птушкі, а за імі і дрэвы. Нават адвечныя лапатухі асіны, і тыя перасталі шапацець сваім лісцем.



Але глухая суцэльная немата гэтая цягнулася нядоўга. Наляцеў аднекуль моцны парыў ветру, ударыў па вершалінах дрэў, і яны гайдануліся, загаманілі. Зашумеў, ажывіўся Нягневіцкі лес, пакаціў зялёныя хвалі аж да самага краю.

Чарнату неба паласнуў асляпляльны зігзаг, і над лесам аглушальна трэснула.

Якімка, які соладка спаў з сябрамі ў зямлянцы, падхапіўся і кінуўся да выхаду. Потым, успомніўшы, што ён не адзін, вярнуўся і раскатурхаў Уладзіка і Васю. (114 слоў)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы аднасастаўныя сказы.
2. Вызначыць, якой часцінай мовай выражаны галоўныя члены ў аднасастаўных сказах. Зрабіць сінтаксічны разбор аднасастаўных сказаў (падкрэсліць).

## ВЫБАРАЧНЫ ДЫКТАНТ

### Бабіна лета

Сярод восені выдаюцца часамі ясныя, светлыя дні. Ціха ўсюды. Вецер не скалыхне ні адзін лісцік, ні адну травінку. Ласкавае неба пазірае на зямлю, нідзе ні хмурынкі. Ясна і хораша. Нібыта вярнулася лета, падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных, светлых і цёплых дзён. Усюды ціха, цёпла і ясна. Так ціха, што чутно, як лятуць пчолкі, як звіняць у паветры тоненькім галаском кучкі мошачак. Але ўжо не вее тым жыццём, якое відаць вясною.

Куды ні кінь вокам, на ўсім убачыш след восені. Хмурны хваёвы лес чуць заслаўся сінім дымком туману, і стаіць не ўзварухнецца, як у якім задуменні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А бярозы, асіны і дубы чырванеюць здалёк сваім лісцем і напамінаюць сабою пра восень. Над усім ляжыць сінявацы слой смугі. (116 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці безасабовыя сказы ў тэксце і выпісаць іх.
2. Падкрэсліць у іх граматычную аснову.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Летнія прыгоды

З самага ранку са сваім сябрам Васілём я адправіўся ў лес. Мы не бралі з сабой ні збанкоў, ні вядзерцаў, ні нават кубкаў. Мы проста хацелі паласавацца суніцамі, крыху пабегаць, пагукаць, праверыць птушыныя гняздзечкі. Што ж, не так даўно скончылі шэсць класаў. Канікулы. Як гаворыцца, маем права пагуляць.

Ды ў гэты дзень усё склалася не так, як заўсёды. На знаёмай паляне, дзе расла магутная разлапістая яліна, убачылі палатку. Здаецца, Васіль першым яе ўбачыў. Хоць не хочацца прызнавацца, але скажу: Васіль жвавейшы за мяне. Ён і гняздзечка першым заўважыць, і вужа, калі той вылезе на палянку, каб пагрэцца. А я валакуся за ім, як звязаны вачыма. Часта апярэджвае мяне Васіль.

Так, так, цяпер успомніў: гэтую палатку ён першы ўбачыў. Убачыў і штурхнуў мяне ў бок. (123 словы)

*Паводле А. Якімовіча*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць яго па памяці.
2. Знайсці аднасастаўныя сказы.
3. Разабраць іх па членах сказа.



## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Бабровіцкае возера

Возера Бабровіцкае. Невыказная ласкавая шэрасць цёплай, амаль зусім спакойнай вады. Навокал — пена пасля нядаўніх баранчыкаў з бела-стракатымі на цёплай шэрасці палоскамі. Мы вярталіся ў імклівай маторцы, над намі тарахцеў верталёт геолагаў, знаёмых старшыні калгаса, які вадзіў нас па гэтых мясцінах.

Там, дзе раней былі Бабровічы, цяпер растуць маладыя бярозы, буяе трава. З-за купіны выскачыў заяц. Пустэча.

У новых, адбудаваных на другім месцы, Бабровічах мы зноў, як і ў іншых пасялішчах, як і ўчора і пазаўчора, запісвалі расказы ацалелых.

Высока зверху — над светлым пакоем калгаснай бібліятэкі, дзе мы слухалі людзей, над новай вялікай вёскай, над усім гэтым азёрна-лясным кутком заходняга Палесся — да самых касмічных арбіт жыве, бушуе ў сэрцы наша перамога, у свеце наспяваюць новыя небяспекі, ідзе змаганне за тое, каб яны не прыйшлі.

Унізе, у глыбінях народнага жыцця, у жыццядайнай праталіне яго крынічаць раны памяці, якія нічым не загоіш... (139 слоў)

*Паводле А. Адамовіча*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць аднасастаўныя сказы.
2. Вызначыць іх від. Праверыць сябе.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Лясная казка

Грыбы... Лясная казка... Паэма сэрца...

Вядома, грыбы не самі па сабе вабілі. Быў лес — імшыстыя, сухадольныя, барвенкавыя сасняки, свет-

4 Зак. 1669



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лыя верасовыя бярэзнікі, зацяты, са стоеным грыбным духам, грабняк, змешаны лес, дзе сярод соснаў, асін і бяроз узвышаўся дуб. Былі неабсяжныя, з рэдкімі хвойкамі разлівы верасоў на пусташах і выгарах, і кожны дзень лес адкрываў позірку, слыху штосьці новае.

Першая яшчэ з сярэдзіны лета скідала ліст бяроза. Тое, што яна тут, паблізу, можна было заўважыць, нават не ўзнімаючы галавы, па залатой замеці лісцяў паміж верасу і травы. Па такой прыкмеце пазнаваўся і дуб — толькі па леташняму лісцю. Яно, нягледзячы на дажджы, слоту, доўга ляжала. Асіна лапатала нават у бязветраныя дні. Пад восень яна рабілася прыгажэйшай ад усіх дрэў. Раўняцца з ёй вогненнымі барвамі мог адзін толькі клён. (125 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННЕ**

Падкрэсліць аднасастаўныя сказы, а таксама часткі складаных сказаў, якія маюць форму аднасастаўных сказаў.

### Чаканне вясны

У полі яшчэ ляжыць снег. Нудна пазіраюць вёскі, засыпаныя снегам. Нідзе не чарнее поле — усё закрыта снегам. Але ў паветры чуецца блізкая вясна. Крывыя санныя дарогі распаўзліся ва ўсе бакі, моцна ўбітыя палазамі, капытамі коней. Пачарнела дарога. Паветра мякчэе, на дварэ цяплее. Далёкі сіні лес ясна выдзяляецца з белізны снегу, цягнучыся ўзгоркамі на краі поля. Паласа лесу ледзь закрыта сіненькім туманам — знакам адлігі.

Чакаюць людзі вясны. Надакучыла зіма сваімі снягамі, марозамі, завеямі і мяцеліцамі. Даволі нацярпеўся холаду чалавек, намерзлася жывёліна ў хляве. А больш за ўсіх чакаюць вясны дзеці. Даўно хочацца ім з душнае хаты на вольнае паветра, на двор, на прастор. Чакаюць яны цёплых дзён вясны, каб выскачыць на вуліцу, пракапаць равок, паставіць



самадзельны млынок і пазіраць, як круціць яго каламутны ручаёк-перавальчык. Што ні кажы, а вясною ўсё ж такі куды лепей! (133 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННЕ**

Падкрэсліць граматычную аснову ў аднасастаўных сказах.

## ПЕРАКАЗЫ

### Першае каханне

Пачалося ўсё вось з чаго. Аднойчы ў скверыку я ўбачыў незнаёмую дзяўчыну. У белай сукенцы, з белым капялюшыкам на галаве, яна мне адразу кінулася ў вочы. Яна была зусім не падобная на дзяўчат, якіх я сустракаў дагэтуль. Трымалася смела, незалежна і, шчабечучы нешта вясёлае, звонка смяялася.

Я ўбачыў белую тоненькую дзяўчыну і ў першы вечар, і ў другі, і ў трэці. І ўвесь час яна была вясёлая, смяялася. Адзін раз нават танцавала.

Першы раз я праходзіў міма дзяўчыны з самым незалежным выглядам. Я не кінуў у яе бок ніводнага прыязнага позірку, стараўся на яе не паглядаць. Лічыў яе асобаю пустой, нікчэмнай, не вартай увагі наогул. У думках нават вінаваціў тоненькую дзяўчыну за яе бестурботны смех, за яе звонкае шчабятанне. Як магла яна смяяцца ў такі час!

Вядома, дзяўчына ў белай сукенцы нічога не ведала пра мае абвінавачванні. Яна кожны вечар прыходзіла ў скверык. Яе жывыя сінія вочы весела пазіралі на свет. І нібы назло мне, яна звонка шчабятала.

Я быў поўны абурэння і гневу. Хоць я яшчэ і не зрабіў ніводнага подзвігу, але ў глыбіні душы лічыў



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест


*Прадмова* ........................................ 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 7

Папераджальны дыктант ........................................ 7
Каменціраваны дыктант ........................................ 8
Творчы дыктант ........................................ 9
Вольны дыктант ........................................ 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 10
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 11
Выбарачныя дыктанты ........................................ 12
Кантрольны дыктант ........................................ 12

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 13

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 20

Пераклад-пераказ ........................................ 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 33

Папераджальныя дыктанты ........................................ 33
Каменціраваныя дыктанты ........................................ 34
Тлумачальны дыктант ........................................ 36
Вольны дыктант ........................................ 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........................................ 37
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 39
Выбарачны дыктант ........................................ 40
Кантрольныя дыктанты ........................................ 40

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 42

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 49

Пераклад-пераказ ........................................ 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 53

Папераджальны дыктант ........................................ 53
Каменціраваны дыктант ........................................ 54
Тлумачальны дыктант ........................................ 54
Творчыя дыктанты ........................................ 55
Вольныя дыктанты ........................................ 56
Выбарачныя дыктанты ........................................ 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 61
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 62
Кантрольныя дыктанты ........................................ 63

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 66

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 91

Папераджальны дыктант ........................................ 91
Каменціраваныя дыктанты ........................................ 92
Тлумачальны дыктант ........................................ 93
Творчы дыктант ........................................ 94
Вольны дыктант ........................................ 94
Выбарачны дыктант ........................................ 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 96
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 97
Кантрольныя дыктанты ........................................ 97

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 99

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 109

Папераджальны дыктант ........................................ 109
Каменціраваны дыктант ........................................ 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 110
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 111
Кантрольныя дыктанты ........................................ 112

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 113

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ ........................................ 121

Папераджальныя дыктанты ........................................ 121
Каменціраваныя дыктанты ........................................ 123
Тлумачальны дыктант ........................................ 124
Творчыя дыктанты ........................................ 125
Вольны дыктант ........................................ 126
Выбарачныя дыктанты ........................................ 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 129
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 129
Кантрольныя дыктанты ........................................ 130

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 132

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 140




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі


ДЫКТАНТЫ ........................................ 146
Тлумачальны дыктант ........................................ 146
Вольныя дыктанты ........................................ 147
Выбарачны дыктант ........................................ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 150
Кантрольны дыктант ........................................ 151
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 152
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 157


## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі


ДЫКТАНТЫ ........................................ 162
Папераджальны дыктант ........................................ 162
Каменціраваны дыктант ........................................ 163
Тлумачальны дыктант ........................................ 164
Вольныя дыктанты ........................................ 164
Выбарачныя дыктанты ........................................ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 168
Кантрольныя дыктанты ........................................ 169
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 171
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 179


## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ


ДЫКТАНТЫ ........................................ 192
Папераджальныя дыктанты ........................................ 192
Каменціраваны дыктант ........................................ 193
Творчы дыктант ........................................ 194
Вольны дыктант ........................................ 195
Выбарачны дыктант ........................................ 195
Кантрольны дыктант ........................................ 196
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 197
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 204
Пераклады-пераказы ........................................ 206


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ